Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
10 ЛЮТАГА 2018 г. СУБОТА № 29 (28645)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Дом на самай мяжы

СТАР. 7



Жарсці вакол айчыннага кіно

СТАР. 8



Новы рытм прыёмнай сям'і

СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У студзені абодва беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы — «Нафтан» і Мазырскі НПЗ — спрацавалі са стратамі. Нават павышэнне з 8 лютага цэн на аўтамабільнае паліва на 2 капейкі кардынальна сітуацыю для прадпрыемстваў не мяняе. Мы не маем уласнай нафты ў такіх аб'ёмах, але ў нас цана на паліва істотна ніжэйшая, чым у Расіі. Па даных «Белнафтахіма», рознічныя цэны на маторнае паліва ў сумежных рэгіёнах Расіі вышэйшыя за беларускія па бензінах на 12 %, па дызельным паліве — на 9 %. Цэны на ўкраінскім рынку вышэйшыя на 48—63 %, чым у Беларусі, на рынку краін Балтыі і Польшчы — вышэйшыя на 108—130% у залежнасці ад віду паліва. Але, нягледзячы на ўсе складанасці і крызісы, трэба весці мадэрнізацыю НПЗ, таму што без яе немагчыма гаварыць аб канкурэнтаздольнасці нафтаперапрацоўчых вытворчасцяў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0017 | ▲ |
| Еўра | 2,4538 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ХХІІІ Зімовыя стартавалі!





Фота БЕЛТА.

Працяг тэмы на 13-й стар.

■ Спажывец

## ЧАСНОК — З КІТАЯ, РУКАЛА — З БЕЛАРУСІ

### Шукаем у крамах айчынную агародніну і яблыкі

**Згодна з рэкамендацыямі, сярэднестатыстычны беларус мусіць з'ядаць у месяц 10 кілаграмаў бульбы, па паўтара кіло памідораў і агуркоў, 450 грамаў зеляніны, тры кілаграмы фруктаў. Ці можна «выканаць план» за кошт айчыннай прадукцыі? «Звязда» вырашыла паглядзець, ці шмат беларускай гародніны і яблыкаў можна знайсці зімой на гандлёвых прылаўках і што танней — купляць сваё ці імпартнае.**

**Фасоўка наша, зеляніна замежная**

Вывучаем асартымент у некалькіх сталічных гандлёвых сетках. У першай з іх знаходзім на прылаўку беларускія агуркі за шэсць рублёў — імпартных канкурэнтаў няма. А вось побач з айчыннымі яблыкамі (яны каштуюць два рублі за кілаграм) ляжаць чатыры сарты польскіх, амаль па такой жа цане. Памідоры (4,80 рубля за кілаграм) — з Турцыі, грушы — з Нідэрландаў. Затое бульба, буракі, морква (мытая пакупнікам асабліва даспадобы) і капуста — з нашых засекаў. Калі вам патрэбна рэпчатая цыбуля, то ёсць беларуская, іншыя ж сарты прывезеныя з замежжа: цыбуля-шалот з Францыі, чырвоная цыбуля — з Украіны.

У другой краме яблыкаў з айчынных садоў не знаходзім. Усе восем відаў, якія выстаўлены на продаж, — з Польшчы, па два рублі за кілаграм і больш. А беларускія агуркі аказваюцца на рубель даражэйшыя за імпартныя... Тая ж сітуацыя і з часнаком — наш каштуе восем рублёў за кілаграм, кітайскі — сем. І выглядае апошні больш прывабна. Салодкі перац у краму пастаўляюць з Македоніі, таматы з Турцыі, Іспаніі і Егіпта. Белакачанная капуста з беларускіх сховішчаў, а пекінская — з украінскіх.

СТАР. 5

■ Біты-нябіты

## БУТЭЛЬКА, АКНО, ЛЮСТЭРКА...

### Пра карысць тараматаў ды вырабы са шклабою

**За год беларусы «спажываюць» 1,8 млрд адзінак тары: шкляных і пластыкавых бутэлек, бляшанак. У 2020 годзе ўсё гэта можна будзе здаваць за грошы ў спецыяльныя тараматы. Так у краіне пачне дзейнічаць дэпазітная сістэма па зборы аднаразовай упакоўкі, большасць якой — шкло. Перапрацаваны шклабой можа стаць і бутэлькай, і шклаватай, і дарогай...**

**Рознакаляровы і несартаваны**



Новая дэпазітна-залогавая сістэма ўводзіцца, каб павялічыць аб'ём нарыхтоўкі шкла з камунальных адходаў, кажуць спецыялісты. Яны мяркуюць, што збор другаснай сыравіны такім чынам узрасце на 10 %. Хоць і цяпер збор гэтай тары і шклабою наладжаны досыць добра. Асабліва пасля таго, як у 2012 годзе ў Мінску была створана спецыяльная вытворчасць для аўтаматычнай сарціроўкі змешанага шкла. Бутэлькі дазволілі здаваць нямытымі, з этыкеткамі і крышкамі, а бітае шкло — не сартаваць па колерах. Забарона на рознакаляровасць сыравіны, дарэчы, была досыць адчувальным абмежавальным бар'ерам, праз які бітае шкло ў вялікіх аб'ёмах трапляла на звалку.

СТАР. 4

# ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

**Менавіта такім годам аб'яўлены ў краіне 2018-ы. Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паведаміў на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод найлепшым работнікам аграрнай галіны.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што для ўсіх малая радзіма — гэта нешта сваё: для кагосьці, напрыклад, родная вёска, для іншых — кавалачак некранутай прыроды. «Прыйшоў час кожнаму не толькі ўспомніць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалачку зямлі. Вельмі хочацца, каб гэта дапамога ішла ад сэрца, стала ўласнай ініцыятывай», — сказаў Прэзідэнт.

На цырымоніі ўзнагароджання сабраліся тыя, хто не па чутках ведае, што лёгкага хлеба не бывае. Мінулы год прайшоў у няпростых кліматычных умовах, але аграрыі забяспечылі краіну хлебам і перавысілі папярэдні вынік. Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці лідарам года па зборы збожжавых. Гэта гаспадаркі Гродзенскай і Мінскай абласцей. «Самая высокая ўраджайнасць атрымана ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Гастэлаўскае» Мінскага раёна (амаль 100 цэнтнераў з гектара)», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Летась добрых поспехаў дасягнулі і ў жывёлагадоўлі. Упершыню сярэднегадавы ўдой малака дасягнуў пяці тысяч кілаграмаў. «Аднак для многіх гаспадарак гэта даўно пройдзены рубеж. У лідарах — «Маладава-Агра» Івацэвіцкага раёна, «Вітэкс» Уздзенскага, «Агракамбінат «Сноў» Нясвіжскага і «Ларынаўка» Аршанскага раёнаў. У кожным вырабляецца звыш 10 тон малака на карову ў год», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па выніках мінулага года вытворчасць прадуктаў харчавання павялічылася больш чым на 3 %. Харчовая бяспека краіны — аснова паспяховай эканомікі. На думку міжнародных экспертаў Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, наша краіна ўваходзіць у першую групу дзяржаў з высокім узроўнем забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання.

Калі паглядзець на рэйтынгі, Беларусь знаходзіцца на чацвёртым месцы ў свеце па экспарце сыроў, на пятым — па экспарце сухога абястлушчанага малака, уваходзіць у тройку па гандлі маслам. Летась наша прадукцыя жывёлагадоўлі выйшла на рынак Кітая. А туды трапіць даволі складана.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што «паспрабаваў у сваім жыцці вельмі многае. Але самыя выдатныя мае гады — гэта работа на зямлі, на вёсцы. Паверце, гэта самая цяжкая праца, гэта самая складаная і цяжкая прафесія. Таму што, асабліва кіраўніку, фермеру, трэба ведаць усё. Там усё жывое — глеба, расліны, жывёлы, людзі. Там трэба ведаць і ветэрынарыю, і аграномію, быць інжынерам... Гэта самыя шматгранныя людзі — якія займаюцца сельскай гаспадаркай». На цырымоніі Прэзідэнту падарылі сувенір — Грамнічную свечку, якая лічыцца сімвалічным абярэгам беларусаў.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды, Падзякі Прэзідэнта і падарункавыя сертыфікаты найлепшым гаспадаркам і работнікам аграрнай галіны, у тым ліку ордэнам Пашаны ўзнагароджаны міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Памяць

# З БОЛЕМ ПРА АФГАН

**Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў мы будзем яшчэ адзначаць 15 лютага, а ўчора ў Шклове адбылася 20-я Міжрэгіянальная сустрэча ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане са Шклоўскага, Бялыніцкага, Круглянскага і Магілёўскага раёнаў.**

Падчас жалобнага мітынгу яны ўсклалі кветкі да памятнага знака воінам-інтэрнацыяналістам і ўшанавалі памяць таварышаў, якія не вярнуліся з вайны, хвілінай маўчання. Са словамі падзякі да іх звярнуўся старшыня Шклоўскага райвыканкама Васіль Віцюноў. Члены маладзёжнага парламента Шклова ўручылі былым салдатам лісты са словамі ўдзячнасці за іх мужнасць і вернасць Радзіме. У гонар загінулых землякоў дзеці запусцілі ў неба белакрылых галубоў.

Пад гукі аркестра былыя афганцы прайшлі ва ўрачыстай калоне па цэнтральнай вуліцы горада — Савецкай. У шэсці прынялі ўдзел салдаты, ганаровыя госці, кадэты, якія неслі ў руках партрэты загінулых салдат і тых, якія потым памерлі ад баявых ран. Наперадзе калоны рухалася баявая тэхніка. Перад раённым Домам культуры вайскоўцы 103-й асобнай мабільнай брыгады з Віцебска прадэманстравалі інсцэніроўку бою. А ў фае ўстановы можна было азнаёміцца з выстаўкай, дзе былі прадстаўлены фота і асабістыя рэчы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы героям вайны ў Афганістане ўручылі юбілейныя медалі, у іх гонар адбыўся канцэрт.

У гэты ж дзень у Шклове прайшоў 29-ы Міждзяржаўны турнір па валейболе і міні-футболе, прысвечаны памяці загінулых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Трэба дадаць, што актыўны ўдзел у фінансаванні мерапрыемстваў гэтай сустрэчы і набыцці сувенірнай прадукцыі прынялі арганізацыі і прадпрыемствы горада і раёна, фермерскія гаспадаркі, індывідуальныя прадпрымальнікі, грамадскія таварыствы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### УРАД ЗША ЗНОЎ ПАВІНЕН СПЫНІЦЬ РАБОТУ З-ЗА АДСУТНАСЦІ СРОДКАЎ

**Міністэрствы, федэральныя ведамствы і службы ЗША ўжо другі раз за год застаюцца без сродкаў для працягу работы, бо кангрэс не прыняў законапраект аб падаўжэнні фінансавання ўрада.**

Апошнім тэрмінам прыняцця законапраекта была поўнач з чацвярга на пятніцу, калі сваё дзеянне спыніла папярэдняя рэзалюцыя, на падставе якой і функцыянавалі дзяржустановы. У заканадаўцаў быў добры шанц не дапусціць гэтага — на разглядзе сената знаходзілася ініцыятыва, якая дазваляла выдзеліць ураду сродкі да 23 сакавіка, што дало б магчымасць кангрэсу завяршыць работу над бюджэтам на канец 2018 фінансавага года, які завяршаецца 30 верасня.

Аднак супраць законапраекта выступіў сенатар-рэспубліканец Рэнд Пол. Яго не задаволіў закладзены ў тэксце план бюджэту адразу на 2018 і 2019 гады. На яго думку, прадугледжанае павышэнне расходаў прывядзе да істотнага павелічэння дэфіцыту федэральнай казны. Ён запатрабаваў ад калег разгледзець яго папраўку.

Атрымліваючы адмову, сенатар кожны раз выкарыстоўваў сваё права запярэчыць, адцягваючы тым самым галасаванне па законапраекце ў цэлым. У гутарцы з тэлеканалам Fox News сам сенатар заявіў, што ён супраць спынення работы ўрада, але таксама не можа мірыцца «з гэтымі бездакзнымі растратамі, якія выйшлі з-пад кантролю».

### САБЧАК ЗАРАБІЛА БОЛЬШ ЗА ЎСІХ СЯРОД КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ РАСІІ

**Ксенія Сабчак, зарэгістраваная кандыдатам у прэзідэнты Расіі, адчыталася ў ЦВК, што за шэсць гадоў зарабіла 404 млн расійскіх рублёў (7 млн долараў). Гэта самы вялікі заробак сярод усіх удзельнікаў сёлетніх расійскіх выбараў.**

У якасці крыніц даходу пазначаны зарплата Сабчак у якасці вядучай на тэлеканале «Дождь», радыёстанцыі «Серебряный дождь» і ТАА «ВД «Глобал медыя груп». Таксама ў крыніцах даходу ў кандыдата ў прэзідэнты — «даходы ад укладаў і каштоўных папер, ад прадпрымальніцкай дзейнасці, ад продажу маёмасці, выплата па дагаворах грамадзянска-прававога характару». Сабчак мае 28 банкаўскіх укладаў, на якіх захоўваецца 417,1 млн рублёў.



Ва ўласнасці ў Сабчак — дзве кватэры ў Маскве і адна ў Санкт-Пецярбургу, жылы дом і зямельны ўчастак у Падмаскоўі, а таксама восем памяшканняў (сем у Маскве і адно ў Пецярбургу). Сабчак валодае аўтамабілем Bentley Continental 2008 года.

### СЯСТРА КІМ ЧЭН ЫНА ПРЫЛЯЦЕЛА Ў ПАЎДНЁВУЮ КАРЭЮ НА ПРЫВАТНЫМ САМАЛЁЦЕ

**Сястра лідара КНДР Кім Чэн Ына — Кім Е Чжон — прыбыла ў Паўднёвую Карэю ў рамках візіту, прымеркаванага да пачатку зімовай Алімпіяды ў Пхёнчхане. Яна прыляцела на прыватным самалёце, які прызямліўся ў міжнародным аэрапорце Інчхон, паведамляе Reuters.**

Сваячка Кім Чэн Ына назірала за цырымоніяй адкрыцця Алімпіяды, якая прайшла ў пятніцу, 9 лютага. Таксама яна і астатнія члены паўночнакарэйскай дэлегацыі наведалі вячэру ад імя прэзідэнта Рэспублікі Карэя Мун Чжэ Іна, на якой прысутнічалі першыя асобы яшчэ прыкладна дваццаці дзяржаў або іх прадстаўнікі, перадае ТАСС са спасылкай на паўднёвакарэйскі тэлеканал YTN.

У суботу, 10 лютага, дэлегаты вернуцца ў Сеул, дзе адбудзецца іх сустрэча з паўднёвакарэйскім лідарам. Мясцовыя СМІ не выключаюць, што падчас перагавораў Кім Е Чжон можа перадаць Мун Чжэ Іну пасланне ад Кім Чэн Ына з запрашэннем наведаць КНДР.

### ГЕНАДЗЬ ДАВЫДЗЬКА СТАЎ СЕНАТАРАМ

Генадзь Давыдзька прызначаны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Адпаведны Указ № 54 ад 6 лютага афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БЕЛТА. Раней Генадзь Давыдзька быў абраны старшынёй рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

■ Блізкая ўлада

# ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

**З самымі рознымі пытаннямі звярнуліся жыхары Салігорскага раёна падчас выязнога прыёму грамадзян да старшыні Мінаблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ. Адны праблемы вырашаны на месцы, іншыя патрабуюць дадатковага вывучэння. Адказы на іх будуць дадзены ў адпаведнасці з заканадаўствам.**

Жыхар аграгарадка Зажэвічы Аляксей Іванавіч паскардзіўся, што вуліца Піянерская, дзе ён пражывае, у не надта добрым стане, асабліва пасля дажджоў, непагадзі. І грэйдзіруецца нерэгулярна, апошні раз работы па ўладкаванні вясковай артэрыі выконваліся ў канцы жніўня мінулага года. На думку мужчыны, праблему можна вырашыць раз і назаўсёды, калі пакласці тут асфальт.

Вуліцы аграгарадка абслугоўвае прадпрыемства «Жыллёва-камунальная гаспадарка «Комплекс». Выконваючы абавязкі дырэктара Дзмітрый Люцко растлумачыў, што ў мінулым годзе грэйдар пастаянна выязджаў у населены пункт. Спецтэхніка пабывала ў аграгарадку сямнаццаць разоў.

З пытаннем асфальтавання пад'язной дарогі звярнуўся і Валерый Сцяпанавіч з вёскі Пружанка.

Райвыканкам вызначаецца з тым, якія дарогі ў першую чаргу трэба асфальтаваць, бетанаваць, грэйдзіраваць, адзначыў губернатар. Але яны павінны ўтрымлівацца ў парадку ў адпаведнасці з нормамі і правіламі. «Зразумейце, я не дам каманду неадкладна зрабіць цвёрдае пакрыццё менавіта ў вашай вёсцы. Я не магу забраць у кагосьці сродкі на гэтыя мэты і аддаць вам, — звярнуўся Анатоль Ісачанка да заяўніка. — Ёсць план фінансавання на ўзроўні аблвыканкама, ён абаронены. Тое, што запланавалі, будзем выконваць».

Кацярына Качаноўская з мужам выхоўваюць траіх дзяцей: адзінаццаці, чатырох гадоў і адзінаццаці месяцаў, жывуць у інтэрнаце. З 2007 года яны стаяць на агульнай чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Пасля таго як у 2017-м нарадзілася немаўля, іх паставілі на чаргу як шматдзетную сям'ю. У гэтым спісе яны значацца пад нумарам 439.

У раёне вядзецца жыллёвае будаўніцтва. І, як вынікае з адказу спецыялістаў, сям'і прыйдзецца пачакаць яшчэ гады два-тры, каб здзейсніць жаданне.

— Падлічыце, што зможаце ў гэтым годзе пабудаваць з улікам магутнасцяў, выдзеленых участкаў і чарговасці. Думаю, раёну трэба паскарацца, — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка.

Жыхар Салігорска Андрэй Уладзіміравіч паскардзіўся, што ў адным пакоі яго кватэры цёпла, а ў другім халадней на некалькі градусаў. Тым больш што ў суседзяў дастаткова камфортная тэмпература. Камунальнікі не выявілі нейкіх дэфектаў. Уласнік прасіў яшчэ раз правесці замеры з дапамогай спецыяльнага абсталявання. Калі пакажа, што цяпло «выпараецца» па яго віне, то ён гатовы за свой кошт выправіляць недахопы. Анатоль Ісачанка даручыў спецыялістам задаволіць просьбу заяўніка.

Фёдар Ігнатавіч з садовага таварыства лічыць, што ўладальнікі двух участкаў самавольна іх пашырылі, тым самым забраўшы частку вулічнага праезда. Акрамя таго, ён паскардзіўся на інтэрвал руху некаторых маршрутаў гарадскіх аўтобусаў. А ў мясцовай бальніцы, на яго думку, не так уладкаваны душавыя кабінкі, туалеты.

Па зямельным пытанні працавала адпаведная камісія, якая прыйшла да высновы, што ўсе ўчасткі афармлены ва ўстаноўленым парадку, даўжыня не перавышае памераў, якія пазначаны ў праваўстаноўчых дакументах, самавольнага захопу зямлі не выяўлена. Адміністрацыя дзяржаўную рэгістрацыю на права валодання ўчасткам можа толькі суд.

— Усе пытанні мы ўзялі «на аловак», яны будуць вывучаны. Што датычыцца графіка руху аўтобусаў, то гэтым зоймуцца спецыялісты абласной службы, — канстатаваў Анатоль Ісачанка.

Віктар Паўлавіч з гарадскога пасёлка Старобін звярнуўся наконт выдзялення яму ўчастка для стварэння базы па рамонце спецтэхнікі.

Справа ў тым, што раней быў зацверджаны акт выбару, на аснове якога прадпрымальнік павінен быў падрыхтаваць праект і прайсці экспертызу, пасля чаго звярнуцца па адвод зямлі. Але ён паспяшаўся: паставіў вакол капітальную агароджу. Атрымліваецца, самавольна заняў зямлю і разгарнуў недазволенае будаўніцтва, за што атрымаў штраф. Адпаведна зямельнаму заканадаўству мужчына павінен знесці незаконную пабудову, прывесці ўчастак у першапачатковы стан і пачаць працэдуру па новай.

— Вядома, ён парушыў закон. Але паспрабуем падысці да яго з разуменнем. Вазьміце пытанне на кантроль, няхай разбярэцца ў ім камітэт эканомікі, будзем прымаць рашэнне ў адпаведнасці з законам, — рэзюмаваў губернатар.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

■ Камунальныя стасункі

# ЖКГ У РЭЖЫМЕ ЖОРСТКАЙ ЭКАНОМІІ

**Затраты на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву сёлета плануецца знізіць на 68 млн рублёў, сабекошт цеплаэнергіі мяркуецца давесці да 80 рублёў за адну Гкал, а святло максімальна мадэрнізаваць. Пра гэта расказаў на выніковай калегіі міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Аляксандр ЦЕРАХАЎ.**

Падводзячы вынікі леташняй працы, ён зазначыў, што затраты на аказанне ЖКП планавалася зменшыць на 93 млн рублёў, што здавалася непасільным. Тым не менш задача была выканана на 118 % — за 2017-ы сэканомлена 110 млн. Пры гэтым лепш за ўсіх справіліся Віцебская вобласць і сталіца.

— Эканоміі дасягнулі не за кошт зніжэння цэн на ўваходныя энергарэсурсы, а дзякуючы рэалізацыі арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў. За кошт зніжэння спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў, змяншэння страт цеплаэнергіі вады, аптымізацыі колькасці і іншых мерапрыемстваў, — падкрэсліў міністр.

Плануецца працягнуць работу і па зніжэнні сабекошту цеплаэнергіі. Павысіць эканамічную і тэхналагічную эфектыўнасць кацельных мяркуюць за кошт ліквідацыі кацельных з вывадам з эксплуатацыі (г. зн. дэцэнтралізацыі), а таксама мадэрнізацыі кацельных, якія працуюць на газе і мясцовых відах паліва.

— Пры неабходным фінансаванні ў 300 млн рублёў эканомія бюджэтных сродкаў складзе каля 80 млн рублёў у год. Тэрмін акупнасці пры гэтым не больш як пяць гадоў. Гэтыя праграмы неабходна ўзяць пад кантроль як самыя эфектыўныя мерапрыемствы па зніжэнні бюджэтнага субсідавання, — заўважыў міністр. — І выгада ад гэтага будзе ў першую чаргу мясцовым бюджэтам.

Не абышлося і без менш аптымістычных вынікаў. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях значна вырасла пратэрмінаваная запазычанасць за паслугі ЖКГ.

— Мы паглядзелі, з чым гэта звязана. Магчыма, упалі даходы насельніцтва па гэтых рэгіёнах. Аднак статыстыка сведчыць пра адваротнае, заробкі тут не самыя нізкія, — заўважыў Аляксандр Церахаў. — Самае сумнае, што адсутнасць сістэмнасці ў гэтай рабоце можа прывесці ў выніку да таго, што ўласнікі страцяць жыллё. Нельга даводзіць сітуацыю да крайнасці, трэба праводзіць своечасовую работу на месцах, каб не ўжываць радыкальныя меры.

Пры гэтым летась 14 тысяч 950 гаспадарак краіны атрымалі безнаяўныя жыллёвыя субсідыі ў памеры 744 тысячы рублёў на аплату паслуг ЖКГ. З іх 80 % дапамога выдзелена па выяўленчым прынцыпе.

Міністр таксама звярнуў увагу, што сітуацыя з рамонтам пад'ездаў далёкая ад ідэальнай. Здараецца, што жыхары адмаўляюцца ад паслуг камунальнікаў, бо ім прасцей наняць арганізацыю збоку. А пры рамонце ў пад'ездах часта фарбуюць сцены, але не мяняюць асвятляльнае абсталяванне. «Губляеце грошы на сваіх аб'ектах», — заўважыў ён прысутным.

75 % пад'ездаў Віцебскай вобласці абсталяваны звычайнымі лямпачкамі, у Мінскай вобласці — амаль 60 % месцаў агульнага карыстання асвятляецца такім чынам, а ў Магілёўскай — 65 %.

— Пра зняцце абмежавальных мер не будзе ніякай гаворкі, пакуль не будзе ўсталявана энергаэфектыўнае асвятляльнае абсталяванне, — рэзюмаваў Аляксандр Церахаў. — Калі мы хочам цывілізаваных адносін у тарыфнай палітыцы, сёлета неабходна вырашыць, як максімальна мадэрнізаваць электраасвятленне.

**Ірына СІДАРОК**

■ Конкурс

# АРМІЯ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ

**Зусім хутка Узброеныя Сілы Беларусі адзначаць 100-гадовы юбілей. Да гэтай даты быў прымеркаваны творчы конкурс сярод школьнікаў на найлепшыя верш, апавяданне і малюнак. А пераможцаў спаборніцтваў узнагародзілі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там жа адбыўся і Урок мужнасці.**




Вельмі таленавітыя работы ва ўсіх трох намінацыях прадставіла на конкурс вучаніца 23-й сярэдняй школы Віцебска Агата Андрэева. За гэта яна атрымала адмысловы прыз — ноўтбук.

— Я сама рабіла ўсё — і апавяданне, і малюнак, і верш. Хацелася данесці, наколькі страшная вайна. Тым больш што апавяданне грунтавалася на рэальных падзеях, якія адбыліся з маёй маці. Побач з вёскай, дзе яна жыла, знаходзілася воінская часць. Аднойчы там пачалі выбухаць боеприпасы — абстаноўка была нібыта на сапраўднай вайне...

Як зазначыў **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід КАСІНСКІ**, усяго школьнікі даслалі больш за тысячу малюнкаў, 300 вершаў, каля 600 разнастайных апавяданняў. З такога масіву цяжка было выбраць пераможцаў.

— Мы ўпэўнены, што хлопчыкі і дзяўчаткі ведаюць гісторыю сваёй дзяржавы, цікавяцца мінулым Узброеных Сіл і разумеюць, што нашаму народу давялося перажыць за час існавання. А значыць, яны будуць цаніць яшчэ больш мір і спакой, якія зараз пануюць у Беларусі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Грошы

# «ПЛАСТЫКАВЫ» РЭКОРД

У краіне імкліва расце колькасць банкаўскіх картак

**На пачатак года на руках у насельніцтва было 13 мільёнаў 854,9 тысячы плацежных банкаўскіх картак, паведамляе Нацыянальны банк. За мінулы год іх колькасць вырасла на 1 мільён 173,5 тысячы штук. Для параўнання, у 2016 годзе картак стала больш на 336,4 тысячы, а за 2015-ы — на 1,9 тысячы.**

Больш за ўсё картак у нацыянальнай плацежнай сістэмы Белкарт — 4 млн 806,1 тысячы і Белкарт/Maestro — 868,5 тысячы. Другое месца займае сістэма VISA — 4 млн 635,8 тысячы, а трэцяе MasterCard — 3 млн 544,5 тысячы.

Доля безнаяўных аперацый па картках летась складала 83,1 %. Для параўнання: у 2010 годзе гэты паказчык быў роўны 49,7 %. Калі параўноўваць па сумах плацяжоў, то па-ранейшаму наперадзе наяўная аплата, на якую прыпадае 55,3 %.

Паводле паведамленняў Нацбанка, за мінулы год у Беларусі вырасла колькасць банкаматаў — да 4404 (плюс 18). А вось інфакіёскаў стала менш — 3294 (годам раней — 3394). Колькасць тэрміналаў у арганізацыях гандлю расце — 150 946 на пачатак гэтага года супраць 139 608 на аналагічны перыяд мінулага года.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Небяспека

# ШАЛЕНСТВА ТРЫМАЕ Ў НАПРУЖАННІ

**Па інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, у 2017 годзе ў краіне былі зарэгістраваны 484 выпадкі захворвання на шаленства жывёл (гэта на 17 % менш у параўнанні з папярэднім годам). Лідзіравалі па гэтым паказчыку Гомельская і Мінская вобласці. Часцей за ўсё шаленства выяўлялася сярод лісіц і свойскіх жывёл (сабак і катоў), якія маюць гаспадароў.**



Дзякуючы прафілактычнай рабоце, што праводзіцца рэспубліканскай санэпідслужбай, выпадкі захворвання на шаленства сярод насельніцтва не рэгістраваліся з 2012 года. Па аказанне антырабічнай дапамогі з прычыны кантактаў з жывёламі з падазрэннем на шаленства звярнулася за мінулы год каля 20 тысяч чалавек. Больш за 90 % з іх паведамлялі пра небяспечны кантакт са свойскімі жывёламі. Як высветлілася пазней, 500 чалавек насамрэч кантактавалі з хворымі жывёламі, у якіх шаленства было пацверджана лабараторна. З дзікіх жывёл часцей за ўсё людзі ўступалі ў кантакт з хворымі на шаленства лісамі. Са свойскіх — з сабакамі, якія маюць гаспадароў. Антырабічная прышчэпкі супраць шаленства былі прызначаны 15 тысячам пацярпелых.

Зусім нядаўна, у студзені 2018 года, у Мінску ў кантакце з хворым на шаленства сабакам пароды канэкорса знаходзіліся 22 чалавекі. Гэты факт расследавалі спецыялісты санэпідслужбы Мінска і Мінскай вобласці. Яны працавалі ў цесным кантакце з зацікаўленымі ведамствамі і ўстановамі. Былі праведзены ўсе неабходныя санітарна-супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы, каб не дапусціць узнікнення выпадкаў захворвання на шаленства сярод людзей.

Медыкі нагадваюць, што шаленства забірае штогод жыцці больш як 50 тысяч чалавек на планеце. Таму ў выпадку непажаданага кантакту нават са знешне здаровай жывёлай — пасля ўкусу, атрымання драпін, пашкоджання скурных пакроваў, пападання сліны — трэба абавязкова звярнуцца да ўрача, пастарацца ізаляваць жывёлу і выклікаць спецыяліста ветэрынарнай службы для кансультацыі і назірання.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# АМФЕТАМІН РАБІЎ ДОМА

**У Бабруйску затрыманы 37-гадовы жыхар, які не толькі актыўна спажываў наркатычныя сродкі, але і самастойна гатаваў смяротнае зелле.**



Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Сінкевіч, падчас вобыску ў доме затрыманага бабруйскія супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі знайшлі цэлую лабараторыю для вырабу асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва амфетаміну. З месца злачынства канфіскаваны прызначаны для хімічнага сінтэзу посуд, каністры з вадкімі хімічнымі рэчывамі, прэкурсоры, інгрэдыенты, абсталяванне для вырабу псіхатропнаў і наркатычных сродкаў і больш за 103 грамы забароненага для абароту рэчыва.

У адносінах да бабруйчаніна Бабруйскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта распачата крымінальная справа па частках 1 і 3 артыкула 328.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота прадстаўлена УУС Бабруйскага гарвыканкама.**

■ Здарэнні

# АПРОЧ ШТРАФУ «ЗАЯЦ» МОЖА СЕСЦІ

Максімальнае пакаранне — да пяці гадоў

**21 студзеня ў сталіцы ў тралейбусе па маршруце № 24 кантралёр грамадскага транспарту папрасіў маладога чалавека прад'явіць білет на праезд. Пасажыр перадаў «прабіты» двойчы талон.**

Тады кантралёр прапанаваў парушальніку выйсці на прыпынку грамадскага транспарту «Дом быту» па праспекце Ракасоўскага для афармлення неабходных дакументаў. «Заяц» аказаў супраціўленне супрацоўнікам «Мінсктранса». У аднаго з кантралёраў з рук выхапіў шарыкавую ручку, якой пачаў наносіць яму ўдары ў вобласць твару. Уцякаючы, «заяц» забыўся свой заплечнік.

Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку была ўстаноўлена асоба маладога чалавека. 20-гадовы ўраджэнец Мінскай вобласці прыехаў у сталіцу з мэтай працаўладкавання і пражываў у сваякоў у мікараёне Серабранка.

Пры апытанні малады чалавек растлумачыў, што праязны білет знайшоў у грамадскім транспарце і вырашыў яшчэ раз ім скарыстацца. Сваякі заклікалі хлопца самастойна звярнуцца ў міліцыю, аднак ён пабаяўся і вырашыў чакаць, калі пройдуць тэрміны прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці.

Зараз, як паведамілі ў Ленінскім РУУС г. Мінска, акрамя штрафу за безбілетны праезд малады чалавек будзе несці адказнасць па крымінальным артыкуле за гвалт альбо пагрозу ў дачы-




ненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі, або іншай асобы, якая выконвае грамадскі абавязак. Максімальнае пакаранне па ім — да пяці гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# СТАРТАВАЎ «ПРОСТЫ МАТЫЎ»

**97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна.**
**102,4 FM — Мядзел, 102,6 FM — Крупкі, 104,2 FM — Барысаў.**
**104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы.**
**105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань.**
**105,5 FM — Беразіно, Чэрвень, 105,6 FM — Старыя Дарогі.**
**107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.**

Творчая майстэрня «Даная» і радыё «Мінская хваля» пры падтрымцы БРСМ Мінскай вобласці, рэдакцый газет «Шапокляк» і «Переходный возраст» абвясцілі Першы абласны фестываль-конкурс творчасці юных удзельнікаў «Просты матыў».

Мэты конкурсу: выяўленне і ўсебаковая падтрымка найбольш таленавітых дзяцей вобласці, знаёмства дзяцей з найбагацейшымі традыцыямі вакальнай культуры. Запрошаны асобныя выканаўцы і музычныя калектывы ад 5 да 16 гадоў. Асноўныя намінацыі: эстрадны, джазавы і народны вакал; спецыяльныя намінацыі: роўныя магчымасці, патрыятычная і аўтарская песня. У журы — медыйныя персоны, у тым ліку кампазітары Леанід Шырын і Генадзь Маркевіч, спявачка Вольга Плотнікава, што, безумоўна, падымае прэстыж конкурсу. Журы ацэньвае канкурсантаў па некалькіх пазіцыях, дзе адна з асноўных — адпаведнасць рэпертуару ўзроставай катэгорыі. Але нават не гэта галоўнае, а тое, што існуе дзіцячае журы, ў яго складзе — зоркі, пры гэтым яны яшчэ і асноўныя вядучыя конкурсу. Гэта ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» розных гадоў Хелена Мерааі, Руслан Асланаў і аўтар праекта — спявачка Даная Шаршавіцкая.


Удзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» розных гадоў Хелена МЕРААІ і Руслан АСЛАНАЎ і спявачка Даная ШАРШАВІЦКАЯ.

Узнагароды ўдзельнікам падрыхтавалі шматлікія партнёры «Простага матыву», штотыдзень радыё «Мінская хваля» будзе знаёміць слухачоў з пераможцамі этапаў. Найлепшыя арыгінальныя песні будуць вызначаны ў ратацыю на радыё. А галоўная ўзнагарода — удзел у канцэрце на адной з пляцовак «Славянскага базару ў Віцебску».

Першы канцэрт адбыўся ў Палацы культуры Заслаўя. Удзельнікаў — а іх было 25 — прывітала старшыня Заслаўскага гарвыканкама Святлана Карташова. У ліку канкурсантаў — дзеці са сталіцы і з населеных пунктаў Мінскага раёна – Новае Поле, Новы Двор, Сеніца.

Член журы, прадзюсар і кампазітар Леанід Шырын адзначыў у інтэрв'ю «Мінскай хвалі», што ў гуманітарнае XXI стагоддзе, стагоддзе гаджэтаў, раўнавагу маладому чалавеку можа надаць толькі культура ў самым шырокім сэнсе слова, у тым ліку музыка: «Тут ёсць магчымасць для дзяцей выйсці і паказаць сябе на сцэне прафесіяналам, якія могуць паказаць і падказаць штосьці, магчымасць паглядзець на сябе сярод роўных у конкурсе, якіх нічым іх не абмяжоўвае ў творчым сэнсе. Ды і проста магчымасць зразумець сябе і быць заўважаным — гэта выдатна. Таксама як і тое, што праходзіць конкурс у раённых гарадах і адкрыты для ўсіх, хто хоча і ўмее спяваць. Ужо першы дзень конкурсу паказаў цікавасць дзяцей да яго, яны вельмі сур'ёзна падрыхтаваліся, ды і я бачу, што конкурс — не заштампаваны, не зафармалізаваны, а дзеці адчуваюць сябе як на свяце. «Просты матыў» — сапраўды такое дзіцячае свята, журы на іх баку. Было відаць, які важны для хлопчыкаў і дзяўчатак удзел у конкурсе. Мы думаем па ходзе конкурсу ўдасканаліць сваю работу — праводзіць нават хуткія майстар-класы. Конкурс развіваецца, таму будзем уносіць карэктывы, якія запатрабуе сама сітуацыя. Я вельмі спадзяюся, што гэты конкурс стане традыцыйным, і жадаю яму многія леты, бо па сабе ведаю, якія важныя першыя крокі ў творчасці, як важна ўбачыць рэакцыю аднагодкаў-гледачоў, як важна ўбачыць падтрымку дарослых і пачуць іх прафесійныя парады».


Члены журы – кампазітары Генадзь МАРКЕВІЧ і Леанід ШЫРЫН, спявачка Вольга ПЛОТНІКАВА.

**Вольга Плотнікава, спявачка: «Мяне зачараваў гэты фестываль, захапіла сяброўская атмасфера! Усё па-добраму, вельмі душэўна. Вось такія конкурсы я люблю! Конкурсы, дзе дзеці выходзяць на сцэну, не баючыся і не хвалюючыся, атрымліваючы задавальненне ад выступлення і гэтым радуючы гледачоў і журы ў зале. Добрая арганізацыя, таленавітыя салісты і калектывы! Я атрымала задавальненне ад гэтага свята жыцця і шчаслівая, што стала яго часткай».**


Удзельнікі конкурсу і члены журы.

Надалей канцэрты-адборы пройдуць ва ўсіх райцэнтрах Мінскай вобласці.

УНП 690262864

# БУТЭЛЬКА, АКНО, ЛЮСТЭРКА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Уся ўпакоўка, якая праходзіць цяпер праз прыёмна-нарыхтоўчыя пункты і кантэйнеры, збіраецца ў асноўным у якасці другаснай сыравіны для наступнай перапрацоўкі. Заводы маюць патрэбу ў гэтай прадукцыі, — расказаў **Аляксей ПІСКУН, намеснік начальніка ўпраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абарачэння з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Сёння ў прыёмныя пункты можна здаць шклотару любога колеру і выгляду. На базе арганізацыі «Белрэсурсы» створана вытворчасць па сарціроўцы шклабою. Тэхналагічны працэс дазваляе выдаляць адсюль лішнія фракцыі і смецце, а таксама разабраць сыравіну па колерах.

**Каб шкло, якое трапіла на сметнік, разбурылася, спатрэбіцца больш за 1000 гадоў.**

Стрымлівалі шкляны збор у Беларусі таксама нізкая цана і адсутнасць кампенсацыі нарыхтоўшчыкам за падрыхтаваную сыравіну. Сёння за кілаграм бітага шкла прыёмшчыкі плацяць ад 4 да 15 капеек у залежнасці ад рэгіёна. Даражэй там, дзе большая канкурэнцыя.

— Рэгуляваць цэны на прыёмку шклабою цяпер не актуальна, — лічыць спецыяліст. — Нарыхтоўшчыкі самі падлічваюць эканамічную мэтазгоднасць кошту, ды і канкурэнцыя ўплывае на цану. А вось кампенсацыя за збор тары нарыхтоўшчыкам адназначная. За сартаваны шклабой — 90 рублёў за тону, за несартаваны — 140 рублёў.

Такія змены летась узнялі аб'ёмы збору шклабою да 181,3 тысячы тон, а яшчэ ў 2012-м было ўтрая менш — 59 тысяч.

## 10 капеек за бутэльку ў тарамаце

Сёлета выпрацоўваецца нарматыўна-прававая база дэпазітна-залогавай сістэмы. У 2019-м зоймуцца прыцягненнем інвестараў. А ў 2020-м у краіне чакаецца з'яўленне некалькіх тысяч тараматаў для прыёмкі аднаразовай шкляной тары аб'ёмам да трох літраў, бляшанак і ПЭТ-бутэлек.

Тараматы будуць устанаўліваць у крамах буйных гандлёвых сетках. У невялікіх крамах размяшчаць такое абсталяванне немэтазгодна, таму для прыёмкі тары тут плануецца задзейнічаць работнікаў гандлёвых сетак. На рэалізацыю ідэі спатрэбіцца прыкладна 100 млн еўра.

— Справа гэта не танная. Але ж мы не імкнёмся да атрымання прыбытку. Перш за ўсё дбаем пра экалагічны складнік, — заўважыў Аляксей Піскун.

Каб чалавек быў зацікаўлены прынесці бутэльку да тарамата ці ў краму, а не выкінуць на сметнік, яе залогавы кошт, як думаюць спецыялісты, будзе 10—20 капеек за адзінку. Прадпрыемствы, якія перапрацоўваюць тарнае шкло, каб атрымаць з яго новыя бутэлькі і слоікі, знаходзяцца ў Гродне, пасёлках Касцюкоўка і Ялізава.

За год сям'я з трох чалавек «спажывае» 82 кілаграмы ўпакоўкі: бутэлек, слоікаў... У гэтай масе трапляецца прыкладна 170 бутэлек. Калі памножыць іх нават на 10 капеек залогавага кошту, атрымаецца, што за год у сямейны бюджэт можна вярнуць праз тарамат 17 рублёў. Альбо выкінуць іх разам са звычайным смеццем.

Шматабаротную шкляную тару, якую ў савецкія часы здавалі проста ў краме і пасля адпаведнай апрацоўкі зноў налівалі туды напоі, малако, кефір, цяпер амаль не ўжываюць. Хоць асобныя нарыхтоўшчыкі працягваюць займацца ёй. Тое датычыцца напояў, якія не разліваюцца ў фірмовыя ўпакоўкі. Як правіла, гэта звычайныя напіткі або слабаалкагольныя, накшталт пладовых вінаў, для якіх асноўная ўмова бутэлькі — аб'ём 0,5—0,7 літра і вінтавое рыльца.

— Ужо даўно купляць аднаразовую ўпакоўку і разліваць у яе напоі стала танней, чым намагацца вярнуць назад сваю тару праз нарыхтоўчыя пункты, — сцвярджае спецыяліст. — Гэта разумеюць вытворцы і алкагольнай, і безалкагольнай, і іншай харчовай прадукцыі. Тыпаў, відаў і памераў аднаразовай упакоўкі, а яшчэ і з фірмавымі лагатыпамі асобных прадпрыемстваў і кампаній, стала так шмат, што збор тары асобна для кожнага вытворцы страціў сэнс. Тым больш што такая справа патрабуе выдаткаў на арганізацыю прыёмкі, транспартавання, мыцця і дэзінфекцыі тары на прадпрыемстве перад паўторным ужываннем.

## «Шкляны кактэйль»

У краіне найбольш запатрабаваны для перапрацоўкі бой менавіта тарнага шкла, аднак астатнія шкляныя вырабы спецыялісты таксама раяць не выкідваць проста на сметнік. Напрыклад, шкло з вокнаў хоць і не варта здаваць у агульнай масе шклабою, бо яго хімічны састаў адрозніваецца ад бутэлечнага, лепш, як і раней, выносіць на сметніцу і ставіць побач з кантэйнерамі або здаваць у прыёмныя пункты. Каштуе яно крыху менш, чым тарнае, аднак асобна прынесенае пойдзе на перапрацоўку. Бітую аконную прадукцыю выкарыстоўваюць завод у Гомелі і арганізацыя «Брэстшклосфера», дзе ліставое шкло — адзін з кампанентаў для вырабу фарбы для нанясення святлоадбівальнай дарожнай разметкі.

Шкло — адзіны матэрыял, які можна перапрацоўваць на 100 % колькі заўгодна разоў. Пры гэтым атрыманая з другаснай сыравіны прадукцыя будзе такая ж якасная, як і выплаўленая ўпершыню з масы, куды не дадаецца шклабой.

**Арміраванае шкло, люстэркі, кераміка, фарфор, аўтамабільныя фары перапрацаваць немагчыма. Калі такое шкло трапіць у агульны шклабой, яго, канешне, адсартуюць, але лепш адразу кідаць яго ў агульныя камунальныя адходы.**

Заводы пры пераплаўцы выкарыстоўваюць адсартаванае шкло аднаго колеру, і перш за ўсё зацікаўлены ў бескаляровым і белым шклабоі, бо ў тару гэтага колеру разліваецца больш за ўсё напояў.

Шклабой падмешваецца ў шыхту — сумесь кварцавага пяску, кальцыніраванай соды, вапняку і спецыяльных дабавак. Робіцца гэта дзеля таго, каб выкарыстоўваць у «шкляным кактэйлі» менш дарагой сыравіны, напрыклад кальцыніраванай соды. Шклабой таксама зніжае выдаткі і паскарае працэс варкі шыхты, бо яна ў такім разе плавіцца пры больш нізкай тэмпературы. Гэта ў сваю чаргу змяншае спажыванне энергіі для працэсу. Акрамя таго, шклабой, да 40 % якога можна дадаць у першапачатковую сумесь, павышае экалагічнасць працэсу варкі, таму што паніжаецца колькасць выкідаў забруджвальных рэчываў у паветра.

**Перапрацоўка 1 тоны адходаў са шкла эканоміць 650 кг пяску, 150 кг кальцыніраванай соды і 200 кг вапняку. Акрамя бутэлек і слоікаў, з сыравіны, у якую дадаецца шклабой, вырабляюць самыя розныя рэчы, напрыклад шкляную вату. Каб яе хапіла для ізаляцыі аднаго дома, трэба перапрацаваць 3000 вінных бутэлек.**
**З перапрацаванага шкла вырабляюць таксама абразіўныя інструменты, сантэхніку з керамікі, прабіркі, выкарыстоўваюць яго пры вытворчасці запалак і будаўніцтве... аўтадарог.**
**За мяжой адходы шкла прымяняюць для вытворчасці лакафарбавых матэрыялаў, шпалерная паперы, пластмасы, і нават думаюць ужываць здробнены шклабой у сельскай гаспадарцы для паляпшэння структуры глебы.**

Ірына СІДАРОК.

■ З нагоды

# МАЛЕНЬКІ ЮБІЛЕЙ ВАЖНАГА ТЭЛЕКАНАЛА

## У гэтыя дні «Беларусь 3» адзначае сваё пяцігоддзе

**Створаны па даручэнні кіраўніка дзяржавы дзеля папулярызацыі і захавання беларускай культурнай спадчыны, ён пачаў сваё вяшчанне ў пачатку лютага 2013-га. А ўжо сёння штодзень канал у эфіры глядзіць звыш мільёна беларусаў. У яго сотні падпісчыкаў у сацыяльных сетках, праграмы маюць больш за паўтара мільёна праглядаў на YouTube.**

Аснову канала складае тэлевізійная і кінематаграфічная прадукцыя айчыннай вытворчасці. Візітнымі карткамі сталі такія любімыя гледачамі перадачы, як «Калыханка», «Дабраранак», «Размаўляем па-беларуску», «Навукаманія», «Святло далёкай зоркі», «Наперад у мінулае», «Музеі Беларусі», «Камертон», «Святыні Беларусі», «Навіны культуры».

Як адзначыла ў прывітальным адрасе **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА**, тэлеканал здолеў заняць асаблівую нішу і забяспечыў сабе пастаянную аўдыторыю. Яна ўхваліла прафесіяналізм і кампетэнтнасць калектыву і пажадала «Беларусь 3» доўгай і цікавай тэлевізійнай гісторыі. **Намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ** заўважыў, што і сам з'яўляецца пастаянным гледачом сацыякультурнага канала:


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Павел Лёгкі прызнаўся, што і сам з'яўляецца гледачом «Беларусь-3».

— Кожную раніцу ўключаю «Беларусь 3», так што я таксама ў ліку той мільённай аўдыторыі гледачоў.

Адметна, што вялікая ўвага на тэлеканале ўдзяляецца папулярызацыі роднай мовы — беларускамоўныя праекты ўласнай вытворчасці складаюць 75 %. Як падкрэсліў стваральнік канала **кіраўнік РГА «Белая Русь» Генадзь ДАВЫДЗЬКА**, Белтэлерадыёкампанія — велізарная нацыянальная каштоўнасць, а «Беларусь 3» — адзін з яе дыяментаў. На яго погляд, у тэлеканала вялікая будучыня, улічваючы дынаміку яго развіцця.

«Беларусь 3» і надалей працягне здзіўляць і радаваць свайго гледача. У эфіры з'явяцца тэлеверсіі ўсіх значных культурных мерапрыемстваў, міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў, форумаў, святаў і пленэраў, канцэртаў, найлепшых спектакляў беларускіх тэатраў, творчых сустрэч з вядомымі дзеячамі культуры і мастацтва.

У новым сезоне 2018/2019 чакаецца і шэраг прэм'ер: цыклы праграм аб прадметах культуры і мастацтва «Артэфакты», пра асаблівасці архітэктуры «Архітэктура Беларусі» і пра нематэрыяльную культурную спадчыну «Жывая культура». Але ўсе сакрэты раскрываць не будзем — глядзіце «Беларусь 3» і ўсё пабачыце самі.

**Алена КРАВЕЦ**

■ Смачна есці!

## «ГРЫБНЫ КОШЫК» І ЗРАЗА «РАДЗІВІЛАЎСКАЯ»

**Тыдзень беларускай кухні пройдзе ў Мінску з 12 па 18 лютага. Акцыя адбудзецца ўжо 16-ы раз, нагадалі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Удзел у ёй возьмуць 90 кавярняў і рэстаранаў сталіцы. Усе яны розныя па тыпе і фармаце, але традыцыйна аб'яднаныя агульнай ідэяй папулярызацыі нацыянальнай кухні і развіцця культуры харчавання. Наведвальнікам прапануюць пяць страў: салату «Грыбны кошык» за 3,7 рубля, густую поліўку з гарбузом, птушкай і грыбамі за 3,5 рубля, зразу «Радзівілаўскую» з бульбяным пюрэ і грыбамі ў смятане за 8 рублёў, свіныя рэбры ў глазуры з квасу і бульбянымі капыткамі за 9 рублёў, пышныя блінчыкі з тварожна-мятным крэмам і клубнічным соусам за 3,5 рубля. Нагадаем, галоўны прынцып Тыдня беларускай кухні — адзіная рэцэптура і цана незалежна ад тыпу і класа аб'екта грамадскага харчавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Мовай малюнка

## ЭКАЛОГІЯ, ЯКОЙ ЯЕ БАЧАЦЬ ДЗЕЦІ

**У краіне стартаваў рэспубліканскі конкурс на самы лепшы дзіцячы малюнак на экалагічную тэматыку, арганізатарам якога выступае Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Ён праводзіцца штогод у мэтах фарміравання экалагічнай культуры падрастаючага пакалення, выхавання ў яго ашчаднага стаўлення да прыроды.

У конкурсе могуць прымаць удзел выхаванцы ўстаноў дашкольнай адукацыі, навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў дзвюх узроставых групах ад 3 да 5 гадоў і ад 6 да 10 гадоў.

Да ўдзелу ў творчым спаборніцтве дапускаюцца работы, выкананыя на працягу 2017—2018 гадоў. Кожная павінна суправаджацца інфармацыйным лістом удзельніка конкурсу з пазначэннем найменне ўстановы адукацыі, прозвішча, уласнага імя і ўзросту, паштовага адрасу і кантактнага тэлефона.

Работы прадстаўляюцца ў каляровым варыянце на лістах фарматам ад А4 да А1. Асобы, якія вырашылі прыняць удзел у конкурсе, накіроўваюць іх у гарадскія і раённыя інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з пазнакай «На рэспубліканскі конкурс на найлепшы дзіцячы малюнак на экалагічную тэматыку».

Конкурс праводзіцца па 1 мая ў тры этапы: першы этап (па 1 сакавіка) — вызначаюцца найлепшыя работы на раённым і гарадскім узроўнях; другі этап (па 1 красавіка) — на абласным узроўні; трэці этап (па 1 мая) — вызначаюцца найлепшыя работы на рэспубліканскім узроўні.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ЧАСНОК — З КІТАЯ, РУКАЛА — З БЕЛАРУСІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ёсць на прылаўках зеляніна, вырашчаная ў нашых цяпліцах, — зялёная цыбуля, кроп, пятрушка, кінза. А вось больш экзатычная «трава» толькі расфасавана ў Беларусі: калі ўважліва прачытаць этыкетку, то даведаешся, што корн і рукала прывезены з Італіі, а шалфей, мята і базілік — з Ізраіля. Добра, што хоць бульба не егіпецкая, а свая, роднеснькая, — па 80 капеек за кілаграм.

Разглядаем паліцы з агароднінай у трэцяй гандлёвай сетцы. Радыска за 7,75 рубля дастаўлена з Польшчы, таматы (ад трох рублёў за кілаграм) — з Турцыі, Украіны, Марока. Брокалі і каляровая капуста таксама вырашчаны не ў нас, а ў Польшчы. З 13 сартоў яблыкаў знаходзім адзін беларускі — ён не самы прыгожы, але самы танны. «Вой, як пахнуць смачна», — удыхае водар айчыннага яблычка пакупніца-пенсіянерка і кладзе некальκі штук у кошык. Затое асартымент нашай зеляніны ў краме радуе. Ёсць і базілік, і шпінат, і рукала, і размарын, і чабор — усё з беларускіх градак.

## Імпартная прадукцыя больш спелая?

У пошуках агародніны і яблыкаў заязджаем на «Камароўку». На некалькіх прылаўках відаць агуркі з айчынных цяпліц — прыгожыя, адборныя. Праўда, дарагія — па пяць-шэсць рублёў за кілаграм.

На адной з вітрын заўважаем беларускія яблыкі па 2,30 рубля. «Гэта з Віцебскай вобласці, — расказвае пра тавар прадаўшчыца Аксана. — Польскія яблыкі пакупнікі не любяць. Грушы чые? Імпартныя. Хоць нашы таксама бываюць, сорту Дзюшэс. Вы іх адразу пазнаеце: яны такімі замучанымі выглядаюць».

Па словах жанчыны, беларускіх памідораў і перцаў у гэты час не бывае. «Дзе вы чулі, каб іх у нас зімой вырошчвалі? Па тэлебачанні? Дык там і мандарыны ў нашых цяпліцах паказвалі, але да нас на продаж такія ні разу не паступалі».

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 05.12.2017 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 28.02.2018** в 10.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by).** Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае не прохождения регистрации, участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации, участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 26.02.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

■ Ёсць такая работа

# ХТО, КАЛІ НЕ ЯНЫ?

## Як становяцца бацькамі сямейнага дзіцячага дома

**У пачатку гэтага года ў Брэсце ўрачыста адкрылі дзіцячы дом сямейнага тыпу па вуліцы Васняцова. Пяты па ліку. Тады нават аб'явілі, што запускаецца новы праект пад назвай «Дзіцячы квартал на Васняцова». Дык вось, пятай сям'ёй сталі Юлія і Андрэй Гуляевы. А Юлія — гераіня нашых публікацый. Напрыклад, у газеце (за 26 лістапада 2016 года. — Аўт.) расказвалася, як Юлія Юр'еўна стала прыёмнай мамай дзяўчынкі Васіліны. І грэх было б прайсці міма навіны, пра тое, што Юлія з мужам сталі бацькамі сямейнага дзіцячага дома.**



### НОВЫ ДОМ І НОВЫ РЫТМ

І вось мы сядзім у іх новым доме. Часу ў нас толькі гадзіна ў шчыльным Юліным распарадку. Наваспечаная прыёмная маці сямейства кажа, што ўжо прывыкла да такога рытму жыцця. А вось адразу было вельмі цяжка. Пераехалі яны сюды ў сярэдзіне снежня з двума дзецьмі. І адразу дабавіліся яшчэ пяцёра: браты Коля і Віця адпаведна трох і шасці гадоў, а таксама 4-гадовая Каця, 9-гадовы Данік і 12-гадовая Карына. Такім чынам у сям'і зараз трое дашкольнікаў і чацвёра школьнікаў. Усіх трэба накарміць, дапамагчы з урокамі і своечасова выправіць па сваіх установах. Школьнікі займаюцца ў другую змену.

— Падымаюся я а шостай гадзіне, — расказвае Юлія. — Гатую лёгкі сняданак і бутэрброды для мужа ў той дзень, калі яму на работу, затым іду будзіць мужа і дзяцей, якім у садок. Малыя самі апранаюцца, нават трохгадовы Коля ўмее гэта рабіць. Пакуль хлопчыкі ўмываюцца, я пасяваю Кацю і Васіліну прычасаць і зрабіць «хвосцікі». У рабочыя дні муж вязе Васіліну ў школу, бо ім у адзін бок, а я вяду малых у садок. Складанасць у тым, што Васю трэба вазіць у спецыялізаваную школу, а гэта фактычна на другім канцы горада. І дарога займае гадзіну туды і гадзіну назад. А далей увогуле, як пашанцуе. У рабочыя дні мужа толькі я магу яе забраць. Гэта значыць, аб адзінаццатай трэба выходзіць з дому, каб да дванаццаці альбо паловы першай, у залежнасці ад раскладу ўрокаў, быць у школе. За тыя дзве гадзіны, якія маю раніцай, са старэйшымі мы рыхтуем урокі і я гатую абед. Навучылася рабіць гэта паралельна. Потым еду сама па першакласніцу, — працягвае Юлія, — а дзеці абедаюць самастойна і выходзяць у школу. Вадзім замыкае дом. Мы прыязджаем каля дзвюх гадзін, абедаем і маем гадзіны дзве часу, каб падрыхтаваць урокі з Васілінай, зрабіць хатнія справы, потым трэба ісці ў садок па малых. Паступова прыходзяць са школы старэйшыя. Вячэраем, дзеці мыюцца і а дзявятай гадзіне кладуцца спаць. Калі муж на рабоце, ён прыходзіць а палове адзінаццатай. Яго абавязкова чакаю, кармлю, і тады ўжо проста падаем і засынаем. Затое дні праходзяць хутка, усё па канвееры, — смяецца Юлія.

### АДАПТАЦЫЯ

Цікаўлюся, што было самым цяжкім напачатку: адаптацыя трэба дзяцей, бацькоў, прыцірка характараў? Раптам атрымліваю нечаканы адказ: мноства праверак. І хоць яны з мужам цудоўна разумеюць, што праверкі — абавязковы сегмент іх работы, але ж павышаная ўвага вельмі напружвае. Тым больш калі прыходзяць з кожнай школы, кожнага садка паглядзець на ўмовы пражывання і выхавання дзяцей. Кожны раз адно і тое ж. Але здаецца, і гэтыя мерапрыемствы менавіта ў такім вялікім аб'ёме можна лічыць пройдзеным этапам.

Вядома, няпроста было перастроіцца Юліі ў вядзенні хатняй гаспадаркі. Напрыклад, памяняць каструлі на васьмі- альбо дзесяцілітровыя, прызвычаіцца гатаваць на такую вялікую сям'ю. Вельмі ўдзячныя Гуляевы шматлікім спонсарам, якія падтрымалі на першапачатковым этапе. Маюцца на ўвазе гандлёвыя і вытворчыя фірмы. Напрыклад, супрацоўнікі «Плодагароднінапрама» прывезлі бульбы, морквы, цыбулі, «Еўраопт» і «Карона» — прадуктовыя наборы, «Савушкін прадукт» забяспечыў на першы час тварагом, смятанай, ёгуртамі. Паводле слоў гаспадыні, нават не ў грашах справа: прыйшлі ў пусты дом, усё трэба купіць, прынесці, а магазіны — не побач. Тым больш іншых клопатаў, звязаных з наваселлем, было многа. Адным словам, Новы год ужо сустракалі ва ўтульным доме ў новым сямейным складзе. Хоць, несумненна, два месяцы яшчэ не тэрмін, каб рабіць нейкія высновы, але Юлія Гуляева не расчаравалася, што выбрала работу маці-выхавальніцы.

Яна гаворыць: «Мы былі ў курсе, якая работа, якая адказнасць нас чакае, бо не раз размаўлялі з калегамі, якія жывуць у суседніх дамах».

### ПРЫЁМНАЯ ДАЧКА

Зноў упэўніваюся, што рашэнне стаць маці сямейнага дзіцячага дома не было для яе выпадковае. Па адукацыі Юлія педагог-матэматык. Паспяховая выпускніца фізіка-матэматычнага факультэта ў школе працавала зусім не доўга. Ёй больш камфортна стала ў дзіцячым садку з малымі выхаванцамі. Потым займалася рэпетытарствам як індывідуальны прадпрымальнік. З першым мужам разышліся, калі сыну было тры гады. Доўга жылі з сынам удваіх, пакуль выпадкова не трапілі ў Кобрынскі дзіцячы дом на дзень адкрытых дзвярэй. З таго дня ў іх з Вадзікам сталі паяўляцца госці на выхадныя — выхаванцы дзетдома. Падчас аднаго з наведванняў яны і ўбачылі Васілінку. Праз паўгода дзяўчынка стала прыёмнай дачкой Юліі. Малую прывезлі ва ўзросце паўтара года, хадзіць яна не ўмела. У новай сям'і паступова стала даганяць сваіх равеснікаў у развіцці. Нястомная мама Юля кожны дзень вадзіла дачку на працэдуры і заняткі, праходзілі курсы лячэння. Эфект відавочны, але праблемы з маўленнем засталіся. Дактары раяць не страчваць надзею, змагацца. Таму і возяць Васіліну ў першы клас за блізкі свет, бо там спецыялізаваная школа з малымі класамі, а педагогі і дэфектолагі маюць значны вопыт заняткаў з такімі дзецьмі.

### РАШЭННЕ ПРЫМАЛІ РАЗАМ

Калі Васілінцы не было і пяці, у сям'і паявіўся тата. Гэта надзвычай рамантычная гісторыя. Юля і Андрэй пазнаёміліся ў інтэрнэце, потым сустрэліся і зразумелі, што знайшлі адно аднаго. Андрэй крута памяняў сваё жыццё і пераехаў з Харкава ў Брэст. На радасць мужа і жонкі дзеці адразу прынялі новага тату. З падлеткам Вадзімам яны сышліся як два інтэлектуалы з іранічным складам розуму і асаблівым пачуццём гумару. А малая нібы толькі і чакала, прыняла новага дарослага з адкрытай дзіцячай душой. Праўда, з работай выпускніку Харкаўскага авіяцыйнага інстытута, былому намесніку дырэктара фірмы, доўга не шанцавала. Але нядаўна ўладкаваўся на прадпрыемства па вытворчасці мэблі — станочнікам. Яшчэ адзін доказ таго, што хто хоча знайсці работу, той яе знаходзіць...

Ужо некалькі гадоў на розных мерапрыемствах сацыяльна-педагагічнага цэнтра Юлія размаўляла з бацькамі дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, прыглядалася да іх работы. Яны з Андрэем ведалі, што ўзводзіцца пяты па ліку і апошні ў Маскоўскім раёне такі дом. Гэта зусім побач з цэнтрам горада, недалёка ад іх кватэры. Падумалі, і на сваім невялікім сямейным савеце прынялі рашэнне. Вадзім таксама не пярэчыў, каб пераехаць у дом, дзе будзе многа малодшых братоў і сясцёр. Ён дарэчы, дапамагае бацькам. Мама кажа, што хлопчык нават крышку ганарыцца сваёй «дарослацю». Бо, напрыклад, калі малодшыя засынаюць, у гадзін дзесяць вечара Юля з Андрэем у яго выхадныя выходзяць на вячэрнюю прагулку, а Вадзім застаецца дома на тэлефоне. Каб не ён, то нават на чвэрць гадзіны нельга было б пакінуць дом. А так можна прысвяціць вечарам 20—30 мінут сабе, як гэта яны рабілі раней. Усё астатняе падпарадкавана жорсткаму графіку.

**І хоць яны з мужам цудоўна разумеюць, што праверкі — абавязковы сегмент іх работы, але ж павышаная ўвага вельмі напружвае.**

Юлія і Андрэй атрымліваюць паўтары стаўкі бацькоў-выхавальнікаў і каля 200 рублёў дапамогі на кожнае прыёмнае дзіця. Зарплата налічваецца фармальна за восем гадзін работы ў дзень, а на працы яны фактычна 24 гадзіны. Цяжкасцяў — хоць адбаўляй: не толькі фізічна ўсё зрабіць, усюды паспець, усім удзяліць увагу. Юля за паўтара месяца работы стала насіць і джынсы, і сукенкі на памер меншыя... Яшчэ адна праблема ў тым, што дзеці часта мяняюцца. Напрыклад, у іх жывуць трое дзяцей з прытулку, іх маці далі паўгода на выпраўленне. І яна зрабіла высновы, кожную суботу прыязджае, тэлефануе пастаянна. Дзеці чакаюць, што вернуцца да сваёй мамы. Значыць, толькі прывыкнуць да гэтых дзяцей, знойдуць падыходы, як давядзецца недзе ў канцы вясны праводзіць іх і сустракаць новых.



Здавалася б, навошта ім патрэбная такая работа. Муж працуе, Юлія магла б, як і раней, займацца рэпетытарствам і атрымліваць нават большыя грошы — і жылі б у сваёй кватэры. Але... У сістэму іх духоўных каштоўнасцяў упісваюцца менавіта абдзеленыя лёсам дзеці. Дык хто ж, калі не яны?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

■ Віншуем!

# Вызначылі найлепшага ляснічага года



**Ім стаў ляснічы Цяруханскага ляснiцтва Гомельскага лягаса Юрый ГОЛУБ, чый стаж работы складае ўжо 21 год. Пераможца конкурсу прафесійнага майстэрства атрымаў дыплом Міністэрства лясной гаспадаркі і каштоўны падарунак.**

Як расказалі ў прэс-службе міністэрства, пазмагацца за званне «Найлепшы ляснічы года» маглі работнікі ўсіх лесагаспадарчых устаноў краіны. Конкурс праходзіў у некалькі этапаў: спачатку кандыдатаў ад лягасаў разглядалі на абласным узроўні, затым яго пераможцы прадстаўлялі абласныя аб'яднанні на рэспубліканскім этапе.

Вызначала найлепшага ляснічага года спецыяльна створаная камісія. Яна ацэньвала ўдзельнікаў па такіх крытэрыях, як выкананне паказчыкаў лесагаспадарчай дзейнасці ляснiцтваў, выкарыстанне і ўкараненне перадавых тэхналогій вядзення лясной гаспадаркі, развіццё паляўнічага і экалагічнага турызму ў лясніцтве і інш. Акрамя таго, улічваліся дзелавыя і прафесійныя якасці канкурсантаў, а таксама іх стаж працы ў арганізацыях Міністэрства лясной гаспадаркі. У выніку былі адабраны шэсць найлепшых ляснічых у краіне, а пераможцам стаў Юрый Міхайлавіч.

Конкурс «Найлепшы ляснічы года» стаў ужо традыцыйным. Галоўная яго мэта — актывізацыя работы ляснiцтваў краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# АЛМАЗЫ І КАВА

## Ці здолее Ангола выкараскацца з крызісу?

АНГОЛА абвясціла аб адмове ад жорсткай прывязкі курсу нацыянальнай валюты — кванзы — да долара ЗША. Прычына такога рашучага кроку — скарачэнне міжнародных рэзерваў краіны ва ўмовах эканамічнага крызісу, справакаванага зніжэннем цэн на нафту з сярэдзіны 2014 года. Як адзначаецца ў паведамленні Цэнтрабанка Анголы, для кванзы ўсталяваны новы цэнавы калідор, паколькі той курс, па якім яна фіксавалася да долара з красавіка 2016 года, больш не адпавядае рэчаіснасці. Пры гэтым параметры калідора не раскрываюцца. Паводле ацэнак аналітыкаў, дзеянні ЦБ Анголы могуць прывесці да падзення курсу кванзы на 20 %, піша Financial Times. Адмова ад прывязкі нацвалюты да долара можа з часам прывесці да перагляду ўмоў выплаты знешняга доўгу гэтай афрыканскай краіны, які складае каля $40 млрд, заявіў кіраўнік Нацбанка Жазэ дэ Ліма Масану. Ці ўдасца Анголе ўрэшце выкарабкацца з працяглага крызісу?

### ЗАМОРСКАЯ ПРАВІНЦЫЯ

Першыя пісьмовыя гістарычныя звесткі пра гэтую тэрыторыю адносяцца да пачатку VI стагоддзя да н. э. Тады бушменаў — тагачасных мясцовых жыхароў — пацяснілі плямёны банту, якія валодалі навыкамі апрацоўкі металу, развівалі вытворчасць керамікі і сельскую гаспадарку. На поўначы гэтых земель у XVI—XVII стагоддзях існавала дзяржава Ндонга, ад спадчыннага тытула кіраўнікоў якой («нгола») і пайшла сучасная назва краіны. У 1482 годзе сюды дабраліся еўрапейцы — на ўзбярэжжы высадзілася эспедыцыя партугальскага мараплаўца Дыегу Кана. У 1576-м закладваецца форт Сан-Паўлу-ды-Луанда, які пасля становіцца сталіцай краіны. Цікава, што ў 1641 годзе галандцы захапілі Луанду, але партугальцы ўжо ў 1648-м вярнулі яе пад свой кантроль.

Да сярэдзіны XIX стагоддзя галоўным заняткам каланізатараў у Анголе быў гандаль рабамі — паводле прыкладных ацэнак, за трыста гадоў з краіны вывезена (у асноўным у Бразілію) каля пяці мільёнаў чалавек. Дарэчы, гэтая афрыканская краіна была больш звязана менавіта з лацінаамерыканскай дзяржавай, чым з метраполіяй. Пасля абвяшчэння Бразільскай імперыі ангольскія каланісты неадночы выказвалі жаданне да яе далучыцца.

У 1951 годзе Ангола атрымала статус «заморскай правінцыі» Партугаліі. У 1958-м у Луандзе пабудаваны першы нафтаперапрацоўчы завод. 11 лістапада 1975 года была абвешчана незалежнасць Анголы. Першым прэзідэнтам становіцца лідар прасавецкай групоўкі МПЛА (Народны рух за вызваленне Анголы — Партыя працы) Агастыньню Нета, войскі якога займаюць Луанду. Аднак незалежнасць не прыносіць афрыканскай краіне міру. Пачалася шматгадовая грамадзянская вайна, якая забрала жыцці больш чым двух мільёнаў чалавек і звыш мільёна зрабіла інвалідамі. Гэтая вайна ўскладняецца міжэтнічнымі супярэчнасцямі. У краіну льюцца патокі зброі. У гады жорсткага супрацьстаяння СССР і ЗША Ангола аказалася арэнай напружанай сутычкі: з трох сфарміраваных па этнічным прынцыпе нацыянальна-вызваленчых рухаў, якія змагаліся з партугальскай каланіяльнай сістэмай, Масква зрабіла стаўку на МПЛА, а дзве іншыя групоўкі — УНІТА (Нацыянальны саюз за поўную незалежнасць Анголы) і ФНЛА (Нацыянальны фронт вызвалення Анголы) — былі падтрыманы Злучанымі Штатамі, ПАР, шэрагам краін Захаду. Вялікую ролю ў зыходзе супрацьстаяння адыграў кубінскі вайсковы кантынгент, які быў накіраваны ў падтрымку МПЛА па рашэнні Фідэля Кастра. СССР аказаў Анголе велізарную эканамічную і ваенна-тэхнічную дапамогу — у канцы 1991 года сума ангольскага доўгу перавышала $5,6 млрд.

### ПАСЛЯ ВАЙНЫ

Жазэ Эдуарду душ Сантуш пасля абвяшчэння незалежнасці Анголы працаваў міністрам замежных спраў. Пасля смерці Агастыньню Нета ў 1979 годзе ён стаў старшынёй МПЛА, прэзідэнтам краіны і галоўнакамандуючым узброенымі сіламі. У 1990 годзе душ Сантуш абвясціў аб пачатку рэформаў — адмове ад марксізму-ленінізму як ідэалогіі партыі, пераходзе да шматпартыйнай сістэмы і рынкавай эканомікі. У краіне было скасавана смяротнае пакаранне. Больш за 20 гадоў душ Сантуш спрабаваў спыніць грамадзянскую вайну ў Анголе, аднак мірныя дамоўленасці ўвесь час зрываліся, і супрацьстаянне ў выніку доўжылася да 2002 года. Баявыя дзеянні завяршыліся толькі пасля таго, як быў забіты лідар УНІТА Жонас Савімбі.

Валодаючы каласальнымі запасамі прыродных багаццяў (у першую чаргу, нафты, газу і алмазаў), краіна прыступіла да аднаўлення.



Сітуацыя змянялася даволі хутка — сталі развівацца жыллёвае будаўніцтва, дарожная інфраструктура, пры ўдзеле замежнага капіталу, перш за ўсё з КНР, пачалі ажыццяўляцца шматлікія праекты. У апошнія 10—15 гадоў Ангола была адной з самых хуткарослых эканомік свету. ВУП у перыяд з 2002-га па 2011-ы павялічваўся ў сярэднім на 11,6 % у год, росту спрыяла падваенне здабычы нафты — да 1,8 млн бараляў у дзень. Даходы бюджэту павялічыліся ў 10 разоў. ВУП Анголы, паводле ацэнак МВФ, з 2002 да 2014 года вырас амаль удвая. У разліку на душу насельніцтва ўжо ў 2008 годзе валавы ўнутраны прадукт перавысіў пяць тысяч долараў, што з'яўляецца вельмі высокім дасягненнем для гэтага рэгіёна свету.



У краіны нізкі ўзровень знешняй запазычанасці, значны прафіцыт бюджэту. Па нафтавых запасах Ангола займае 16-е месца ў свеце, па запасах прыроднага газу — 35-е месца, па здабычы алмазаў — увогуле 4-е месца. Краіна атрымала ад Кітая ў 2003—2009 гадах крэдыты на агульную суму ў 17,4 млрд долараў. Буйныя пазыкі таксама паступілі ад Бразіліі, Партугаліі, Германіі, Іспаніі і Еўрасаюза.

Прамысловасць скіравана на здабычу нафты, алмазаў, інертных будаўнічых матэрыялаў, прыроднага асфальту. Рэканструююцца старыя нафтаперагонныя заводы, будуюцца новыя. Актыўна развіваецца экспарт прыроднага газу — завод па яго звадкаванні ўведзены ў эксплуатацыю ў 2013-м, а першая партыя адпраўлена за мяжу ў чэрвені таго ж года. Ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка радовішчаў жалезнай руды і марганцу для аднаўлення іх экспарту. Праводзіцца дэталёвая геалагічная разведка на раней зафіксаваных праявах фасфатаў, баксітаў, медзі, золата, урану, тытану, марганцу. Аднаўлены або пабудаваны новыя прадпрыемствы па вытворчасці цэменту, па апрацоўцы граніту і мармуру, вытворчасці прадуктаў харчовай прамысловасці. Адраджаецца тэкстыльная вытворчасць, якая будзе працаваць на мясцовай сыравіне.

### ДВА ДОЛАРЫ Ў ДЗЕНЬ

Аднак карупцыя развівалася яшчэ хутчэй (па версіі Transparency International краіна апошнія некалькі гадоў уваходзіла ў спіс дваццаці самых карумпаваных дзяржаў), сацыяльнае расслаенне дасягнула крытычных велічынь. Сярэдні клас у краіне ўяўляе сабой тонкую праслойку паміж нешматлікімі вельмі багатымі грамадзянамі і асноўнай масай людзей, якія ледзь зводзяць канцы з канцамі. Сам прэзідэнт Сантуш прызнаваў, што «з кожных 100 ангольцаў 60 жывуць ніжэй за рысу беднасці, не могуць нармальна харчавацца, не маюць вольнага доступу да пітной вады, санітарыі, медыцынскага абслугоўвання, адукацыі». Паводле афіцыйнай статыстыкі, каля 70 % жыхароў краіны жыве на даход менш за два долары ў дзень.

Новы прэзідэнт Анголы Жуан Ларэнсу, які займае гэтую пасаду з канца верасня 2017 года, правёў шэраг маштабных перастановак ва ўрадзе і кіраўніцтве дзяржкарпарацый, у тым ліку ён змяніў кіраўніка ЦБ. Адным з першых рашэнняў новага кіраўніка дзяржавы стала адхіленне дачкі папярэдніка Ізабэль душ Сантуш ад пасады прэзідэнта дзяржаўнай нафтавай кампаніі Sonangol. Былі зроблены буйныя кадравыя перамены ў сілавых структурах. Эканамічная палітыка Ларэнсу рэзка адрозніваецца ад дзеянняў яго папярэдніка Жазэ Эдуарду душ Сантуша, які кіраваў краінай на працягу 38 гадоў. Эканоміка Анголы панесла істотныя страты з-за падзення цэн на нафту, якая забяспечвае каля двух трэціх дзяржаўных даходаў і 95 % валютнай выручкі. Рост ВУП, які на працягу амаль дзесяці гадоў выражаўся двухзначнымі лічбамі, замарудзіўся. Урад краіны быў вымушаны звярнуцца па крэдыты да Міжнароднага валютнага фонду, Сусветнага банка і Кітая. Міжнародныя рэзервы Анголы скараціліся з $20 млрд у пачатаку 2017 года да прыкладна $14 млрд у пачатку 2018-га.



Неабходна тэрмінова рэагаваць на выклікі, якія цяпер паўсталі. Паводле справаздачы ААН, Ангола — адна з тых краін, дзе інвестыцыі акупляюцца лепш за ўсё. Па словах спецыялістаў, менавіта цяпер неабходна шукаць сваё месца на рынку. Дзяржава перажывае перыяд структурных перамен, у выніку якіх эканамічныя паказчыкі да 2045 года павінны быць падвоены.

### ПРЫКМЕТЫ РЭФОРМАЎ

Перадвыбарчую кампанію Жуан Ларэнсу вёў пад лозунгам «Палепшым добрае, выправім дрэннае». Ён прапануе дыверсіфікаваць эканоміку краіны для пераадолення бягучага эканамічнага крызісу. Як адзначаюць спецыялісты, неабходна зрабіць эканоміку гэтай краіны больш разнастайнай. Напрыклад, адысці ад сыравіннай залежнасці і пераключыць увагу на сельскую гаспадарку і турызм, адзначае Euronews. Пры гэтым нельга забываць аб развіцці інфраструктуры, мадэрнізацыі ў энергетычнай сферы і павышэнні інвестыцыйнай прывабнасці.

Ларэнсу адстойвае неабходнасць развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, павелічэння інвестыцый у інфраструктуру, адукацыю і ахову здароўя. У адрозненне ад многіх прадстаўнікоў ангольскага істэблішменту новы кіраўнік не быў замяшаны ў карупцыйных скандалах. Да абрання прэзідэнтам Анголы Ларэнсу быў міністрам абароны. Дарэчы, у гэтай якасці ў 2015-м ён наведваў Маскву і правёў перамовы з Сяргеем Шайгу. Міністр абароны Расійскай Федэрацыі назваў узброеныя сілы Анголы «адным з гарантаў бяспекі ў Цэнтральнай Афрыцы».

Жуан Ларэнсу значна змяніў палітычны стыль прэзідэнцтва. Ён скараціў колькасць сваёй асабістай аховы, часцей ездзіць па краіне, больш мае зносін з насельніцтвам. Элітная прэзідэнцкая гвардыя перададзена ў вайсковае падпарадкаванне. Кіраўнік дзяржавы наведаў Кабінду — аплот апазіцыі і ачаг паўстанцкага руху — і правёў там ноч (што раней лічылася недапушчальным з меркаванняў бяспекі).

11 лістапада 2017 года, у Дзень незалежнасці Анголы, Ларэнсу выступіў на мітынгу ў Лубанга і ахарактарызаваў сябе як «прэзідэнта ўсіх ангольцаў», а не толькі МПЛА. Яго сустрэча са старшынёй УНІТА Ісаяшам Самакувай прайшла ў атмасферы дэманстратыўнай зычлівасці. Эксперты лічаць гэтыя перамены прыкметамі неабходных структурных рэформаў. Больш адкрыты, раскаваны палітычны стыль прэзідэнта, які суправаджаецца жэстамі добрай волі ў дачыненні да апазіцыі, рэзка кантрастуе з пазіцыяй яго папярэдніка. Гэта можа даць новаму лідару Анголы дадатковыя рычагі для выпраўлення сітуацыі ў краіне.

**Захар БУРАК.**

■ Легенды спорту

# ЯНА СКАРЫЛА ЛЫЖНЮ

Рыта Ачкіна — першая беларуска, якая заваявала медаль на зімовых Алімпіядах

**Упершыню нашы спартсмены прынялі ўдзел у «белых» Гульнях у 1964 годзе ў аўстрыйскім Інсбруку. Тады ў складзе зборнай СССР выступалі канькабежац Эдуард Матусевіч і лыжніца Рыта АЧКІНА. Заваяваць медалі ў Інсбруку беларусам не ўдалося, а вось праз чатырохгоддзе ў Грэноблі Ачкіна стала першай спартсменкай нашай краіны, якой скарыўся п'едэстал зімовых Алімпіяд. У пачатку гэтага месяца яна адзначыла свой 80-гадовы юбілей.**





## Дачка партызанкі і чэмпіёна

Ачкіна нарадзілася ў Магілёве 1 лютага 1938 года, Рытай дзяўчынку назваў бацька Мікалай Іванавіч, менавіта Рытай, а не Маргарытай. Як падазрае чэмпіёнка, на выбар імя паўплывала папулярная ў тыя гады песня «Рыа-Рыта».

Бацька яе прайшоў усю вайну, а пазней стаў вядомым у краіне спартсменам — чэмпіёнам рэспублікі па боксе і лёгкай атлетыцы. А вось маму Рыта Мікалаеўна практычна не памятае, яна была сувязной партызанскага атрада і загінула. Выхаваннем будучай чэмпіёнкі ў Магілёве займалася бабуля, таму што бацька другі раз ажаніўся і жыў у Мінску.

Рыта Ачкіна расла моцнай дзяўчынкай і хацела пайсці па спартыўных слядах бацькі. *«Мне было ўсё роўна чым займацца, галоўнае, каб спортам»*, — успамінае Рыта Мікалаеўна. Дзяўчынка паспрабавала трапіць у секцыю гімнастыкі, але там адмовілі, маўляў, такіх моцных і здаровых у гэтым відзе спорту не бывае. Тады Рыта пайшла ў лыжную секцыю, дзе займаліся адны хлапчукі. Звычайна трэнер не браў дзяўчат, таму што яны гультаяватыя і не такія здольныя, але Ачкіна літаральна за тры трэніроўкі даказала адваротнае. Тады яе першы настаўнік і напрарочыў Рыце быць чэмпіёнкай.

Дзяўчына паступіла ў Інстытут фізкультуры і пераехала ў Мінск да бацькі, пачала выступаць за каманду БССР і неўзабаве стала адной з найлепшых лыжніц Савецкага Саюза.

Яе першая Алімпіяда адбылася ў 1964-м, у Інсбруку ў пяцікіламетровым спрынце яна заняла 10-е месца. Праз год выйграла чэмпіянат СССР, дарэчы, менавіта перамогі на першынстве Саюза Ачкіна называе самымі каштоўнымі, а ў 1966-м стала чэмпіёнкай свету ў лыжнай эстафеце ў Нарвегіі і заваявала бронзавы медаль на дыстанцыі 5 км.

## Мароз і насмарк у Грэноблі

На сваю другую Алімпіяду Рыта Ачкіна ехала ўжо больш дасведчаннай спартсменкай, папярэднія вынікі давалі падставу спадзявацца не проста на п'едэстал, а на першыя месцы. Аднак да старту Гульняў здарылася непрыемнасць — дзяўчына прастудзілася і не змагла паказаць усё, на што была здольная ў той год. На пяцікіламетровай дыстанцыі яна заняла толькі шостае месца, хоць саступіла пераможцы ўсяго 6—7 секундаў, што па тых часах было вельмі мала. Жаночая эстафетная каманда СССР у 1968 годзе падабралася таксама досыць моцная, у гонцы 3х5 км на першым этапе бегла Аляўціна Колчына, на другім — Рыта Ачкіна, на трэцім — Галіна Кулакова. У гэтым складзе лыжніцы выйгралі алімпійскую «бронзу», прапусціўшы наперад каманды Нарвегіі і Швецыі. *«Тую Алімпіяду я ўспамінаю з нейкім пачуццём горычы, — расказвае Рыта Мікалаеўна. — Невялікі мароз, дзесьці мінус тры, напэўна. Памятаю са змазкай лыж у мяне было не вельмі. А галоўнае — я прастудзілася і не змагла сябе толкам праявіць у індывідуальных гонках. Ды і ў эстафеце мы маглі ўзяць узнагароду больш каштоўную, чым бронза»*.

## Пасля Алімпіяды — Масква

А яшчэ 1968-ы стаў асаблівым для Рыты Мікалаеўны не толькі з-за Алімпіяды, у гэтым годзе на спаборніцтвах яна пазнаёмілася з лыжнікам, які пазней стаў яе мужам і забраў магіляўчанку ў Маскву. Хутка ў сям'і спартсменаў нарадзілася дзіця, свякроў узяла на сябе клопаты па доглядзе за малым, а Ачкіна працягнула выступаць.



Пасля заканчэння прафесійнай кар'еры спартсменкі Рыта Мікалаеўна занялася педагагічнай працай. *«Трэнерам быць не хацела, надакучыла ўсе суботы і нядзелі аддаваць трэніроўкам, ні дзяцей, ні сям'і не бачыць»*, — успамінае яна. У сельгасакадэміі, у якой выкладала фізкультуру першы час, акрамя ўсяго іншага Ачкіна адказвала за лыжную падрыхтоўку, праводзіла спаборніцтвы. Потым Рыта Мікалаеўна працавала ў педагагічным вучылішчы, а ўжо бліжэй да пенсіі пайшла па слядах бацькі, які ўсё жыццё прапрацаваў настаўнікам фізкультуры ў школе. *«Праца цяжкая, але цікавая. Дзякуючы спорту я спазнала радасць вялікіх перамог, спазнала вялікую славу і сёння шчаслівая бачыць вочы сваіх вучняў, якія іскрацца радасцю»*, — так чэмпіёнка расказвала пра сваю работу.

Да гэтага часу Рыта Ачкіна з'яўляецца адзінай прадстаўніцай Беларусі, якая заваявала алімпійскую ўзнагароду ў лыжных гонках ■

# Алімпійскі агонь загарэўся

Гульні-2018 стартавалі

**Аматары спорту чакалі гэтай падзеі некалькі гадоў, спартсмены рыхтаваліся ўвесь алімпійскі цыкл, а вось Пхёнчхан чакаў, калі менавіта яму аддадуць права прымаць Алімпійскія гульні больш за 10 гадоў. У 2003-м ён прайграў выбары канадскаму Ванкуверу, у 2006-м — расійскаму Сочы, і толькі з трэцяга разу (у 2011-м), Паўднёвай Карэі даверылі правядзенне самага маштабнага спартыўнага турніру планеты.**

Яны рыхтаваліся да Гульняў сем гадоў — будавалі новыя дамы для алімпійскай вёскі (дарэчы ўсе кватэры ў ёй ужо прададзены, пасля завяршэння Параалімпіяды туды засяляцца новыя жыхары), дарогі і хуткасную чыгунку, якая звязала Сеул з Пхёнчханам.

І вось надышла кульмінацыя, на алімпійскім стадыёне ўчора запаліўся агонь, прагрымелі ўрачыстасці цырымоніі адкрыцця Алімпіяды-2018 і адбыўся парад краін-удзельніц.

## ТЭХНАЛОГІІ

Паўднёвая Карэя здзіўляе новымі тэхналогіямі, гэта датычыцца ў першую чаргу цягнікоў, якія ад Сеула да Пхёнчхана рухаюцца з хуткасцю 300 км/ч. Па-другое, на Алімпіядзе ўпершыню ў свеце будзе выкарыстаны самы хуткі інтэрнэт 5G. Патрэцяе, знайсці маршрут па горадзе турыстам дапамагаюць робаты.

## ВАЛАНЦЁРЫ

Больш за 17 тысяч чалавек дапамагаюць удзельнікам XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў. Перад пачаткам турніру ўсе валанцёры прайшлі базавыя курсы, якія дазваляюць ім выконваць свае абавязкі найбольш якасна. Кожны з добраахвотных памочнікаў апрануты ў адметную чырвона-шэрую форму для таго, каб быць прыкметным ва ўсіх месцах правядзення Алімпійскіх гульняў, уключаючы транспартныя развязкі.

Сярэдні ўзрост валанцёраў у Пхёнчхане складае 26,4 года. Акрамя Рэспублікі Карэя, большасць з іх прыбылі на Алімпіяду з ЗША, Канады і Расіі.

Валанцёры ў ходзе падрыхтоўкі і правядзення Гульняў выконваюць мноства задач у розных галінах, уключаючы транспарт, рассяленне, узаемасувязь са сродкамі масавай інфармацыі, ажыццяўляюць моўную падтрымку. Больш за трэць з іх застануцца на Параалімпійскія гульні, якія пройдуць з 9 па 18 сакавіка.

## ВІРУС

У СМІ з'явілася інфармацыя, што ў пітной вадзе Пхёнчхана выяўлены вірус. На працягу чатырох дзён некалькі супрацоўнікаў органаў бяспекі, якія павінны несці службу падчас Алімпійскіх гульняў, адчулі недамаганне і паскардзіліся медыкам на болі ў жываце. У цэлым у 36 чалавек быў выяўлены наравірус, які стаў прычынай кішэчнай інфекцыі. Устаноўлена, што вірус утрымліваўся ў пітной вадзе.

Наравірус — гэта ўзбуджальнік кішэчнай інфекцыі, які перадаецца харчовым, водным або кантактна-бытавым шляхам. Гэты вірус надзвычай заразны, пры пападанні ў арганізм ён можа выклікаць агульную слабасць, павышэнне тэмпературы, галаўны боль, млоснасць, дыярэю. Перыяд з моманту заражэння і да з'яўлення сімптомаў звычайна складае 12—48 гадзін.

Каментуючы гэтую навіну, **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту і кіраўнік медыцынскай групы ў Пхёнчхане Генадзь ЗАГАРОДНЫ** адзначыў, што «не варта абвастраць страсці, таму што сітуацыя не выклікае трывогі». Паводле папярэдняй медкамісіі МАК, па стане на 8 лютага, захварэўшымі лічацца 60 сек'юрыці, якія жылі не ў Алімпійскай вёсцы, а за 20 кіламетраў ад яе. Пры гэтым у медыцынскую службу вёскі ў Пхёнчхане, з прыкметамі наравіруса, звярнуліся ўсяго тры атлеты. «Каб засцерагчыся ад магчымага захворвання, трэба выконваць элементарныя гігіенічныя правілы», — рэзюмаваў Генадзь Загародны. — Вынік толькі ў руках спартсменаў».

## СЁННЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Яны ў Пхёнчхане пачаліся яшчэ да цырымоніі адкрыцця, першымі ў барацьбу ўступілі прадстаўнікі кёрлінга і скачкоў з трампліна ўжо 8 лютага. Нашы алімпійцы стартуюць сёння.

Спаборніцтвы па біятлоне адкрыюцца жаночай спрынтарскай гонкай, у якой выступяць Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко і Надзея Пісарава. Заўтра, 11 лютага, пройдзе мужчынскі спрынт. У ім Беларусь прадстаўяць Уладзімір Чапелін, Сяргей Бачарнікаў, Раман Ялётнаў і Антон Смольскі.

Нашы біятланісты засяліліся ў алімпійскую вёску першымі з беларускіх спартсменаў, і ўвесь гэты час праводзілі падрыхтоўку непасрэдна на месцы падзей. *«У Пхёнчхане вельмі холадна. Пранізлівы вецер уплывае на якасць стральбы: ён дзьме ўвесь час, таму момантамі кулі здувае на парадак дзесяці сантыметраў*, — каментуе **старшы трэнер нацыянальнай каманды па біятлоне Юрый АЛЬБЕРС**. — *Траса ж падрыхтавана добра, снег жорсткі, перамёрзлы. Ён тут упераменшку са штучным. Розніца ў часе з Беларуссю — 6 гадзін, з Еўропай — 8 гадзін. Гэта накладвае свае адбіткі, але мы спецыяльна прыехалі сюды раней з разлікам прайсці часавую акліматызацыю. Усе спартсмены ў прыўзнятым настроі, таму што прыехалі на Алімпійскія гульні»*.

Таксама сёння стартуюць канькабежцы, Марына Зуева будзе выступаць на дыстанцыі 3000 метраў. Трэнер нацыянальнай зборнай па гэтым відзе спорту Сяргей Мінін адзначыў, што трэніроўкі ў Пхёнчхане ў яго падапечных прайшлі добра, са стадыёнам, на якім будзе праходзіць турнір, спартсмены знаёмыя яшчэ з мінулага года (там праходзіў чэмпіянат свету), ды і ўмовы надвор'я ніяк не павінны паўплываць на выступленні нашых канькабежцаў.

На лыжную трасу сёння выйдуць беларускія спартсменкі — Юлія Ціханава і Паліна Сераносава, яны выступяць у скіятлоне.

*«Мы прыбылі ў Карэю ў баявым настроі. Наша зборная змажа выставіць у тым ліку дзве паўнавартасныя эстафеты — мужчынскую і жаночую*, — расказвае **старшыня Беларускай федэрацыі лыжнага спорту Андрэй КАВАЛЕНКА**. — *Казалі, быццам тут страшныя трасы. Але, прaехаўшы іх на лыжах, адзін з нашых трэнераў, Віктар Камоцкі, запэўніў, што гэта не зусім так. У той жа расійскай Малінаўцы, у Архангельскай вобласці, дзе рыхтаваліся да Гульняў яго падапечныя, кругі нашмат больш складаныя. Ды і не толькі там, так што рэльеф тут, хутчэй, рабочы»*.

Яшчэ пару дзён таму ў Пхёнчхане стаялі моцныя маразы, **прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту Джанфранка КАСПЕР** нават паведаміў, што спаборніцтвы па лыжных гонках могуць быць адменены. *«У FIS ёсць правілы, згодна з якімі пры тэмпературы мінус 22 градусы спаборніцтвы па лыжных гонках могуць не адбыцца, калі так вырашаць дырэктар гонкі і лекары. Пры гэтым важна, якая будзе вільготнасць. Калі нізкая, то спаборніцтвы могуць праходзіць і пры мінус 30 градусах, у адваротным выпадку мінус 22 — гранічны паказчык. Тут вільготнасць даволі высокая»*.

**Старшы трэнер зборнай Беларусі па лыжных гонках Іван ЛІСТАПАД** адзначыў, што пры такім марозе трэніравацца спартсменам было даволі складана. *«Трэніравацца цяжка, таму што холадна, і траса вельмі жорсткая. Тым, у каго ёсць праблемы з дыхальнымі шляхамі, выступаць будзе нашмат больш складана»*.

Адзначым, што сёння на лядовым стадыёне Канына выступіць і адзін з дэбютантаў Алімпійскіх гульняў Максім Сяргееў, у шорт-трэку ён будзе спаборнічаць на дыстанцыі 1500 метраў.

***Пажадаем нашым спартсменам поспехаў!***

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ по объекту: «Район жилой усадебной застройки деревни Заценъ». 4-й пусковой комплекс. 1-я очередь строительства. Комплексная жилая застройка участка по ул. Заценъ, 6, опубликованную в газете «Звязда» от 04.11.2017 № 214 (28578)**

Абзацы 62, 63 и 64 проектной декларации изложить в новой редакции:

«**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:**

**8 квартир в блокированном жилом доме на восемь квартир № 10 по генплану,** общей площадью от 127,66 кв. м до 128,86 кв. м, **2 квартиры в блокированном жилом доме на две квартиры** общей площадью 137,25 кв. м, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 890 (восемьсот девяносто) долларов США.

**Условия оплаты.** Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа на специальный и расчетный счета застройщика в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Документы для подачи заявления и заключения договоров будут приниматься с 16 февраля 2018 года **по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел.: 306-07-26, 8 029 311-15-15** УНП 190580566

**Извещение о проведении 22 февраля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; «складское помещение для хранения дров» общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; «техническое помещение для обслуживания водонапорной башни» общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215; стол «Амадей» т102 (инв. № по бух. уч. 609); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (инв. № по бух. уч. 611); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (инв. № по бух. уч. 616); машина стиральная Gorenje WS43101 (инв. № по бух. уч. 682); водонагреватель Ariston SG HP 200V (инв. № по бух. уч. 6646); киевница напольная ПАЖ-2 (материал ясень) (инв. № по бух. уч. 4905); светильник «Венеция» (инв. № по бух. уч. 4908); стул «Амадей» s102 (инв. № по бух. уч. 4565); стул ИЗО Black (инв. № по бух. уч. 6554); тумба для ТВ «Ниагара» (инв. № по бух. уч. 2955); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (инв. № по бух. уч. 4931); шары «Арамит Премьер» (инв. № по бух. уч. 16); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (инв. № по бух. уч. 1); электросушилка для рук Puff-8820 (инв. № по бух. уч. 1); антенна Variant 60 (инв. № по бух. уч. 7815); бра «Орхидея» 13200/2 (инв. № по бух. уч. 6298); зеркало (инв. № по бух. уч. 2913); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,5*2,2 кв. м (инв. № по бух. уч. 11726); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,7*1,7 кв. м (инв. № по бух. уч. 11727); кий «Гигант-М», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (инв. № по бух. уч. 4910); кий «Онтарио» 1РС целый, 149 см (материал: канадский клен) (инв. № по бух. уч. 4909); кий «Ярость», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (инв. № по бух. уч. 4911); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (инв. № по бух. уч. 615); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 куб. м (инв. № по бух. уч. 166); телевизор «Горизонт» 21KF19V (инв. № по бух. уч. 596); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (инв. № по бух. уч. 5661) |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 195 954,58 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 19 500,00 бел. руб. |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 22 февраля 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.02.2018 по 21.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(024) 970-96-06; (029) 602-33-12 (ОАО «ДСТ № 5»)

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «КОРОНА СУПЕРПРИЗ»

Завершилась Рекламная игра «Корона СУПЕРПРИЗ», в результате которой происходил розыгрыш текущих призов: кофе, пицца, подарочный сертификат «Корона» номиналом 20,00 бел. руб., денежный приз на сумму 1000,00 бел. руб.

Самым значимым событием стал розыгрыш Главного приза в размере 200 000,00 бел. руб.

**Для участия в розыгрыше призов было необходимо:**

1. В период с 9.00 15 сентября 2017 г. по 02.00 16 декабря 2017 г. на территории проведения Рекламной игры совершить единовременную покупку на сумму не менее 20,00 бел. руб. (без учета стоимости алкогольных/слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий), включая не менее 1 (одной) единицы товара «Ключ к игре» либо не менее 400 г весового товара «Ключ к игре».

2. После полной оплаты покупки выбрать в кассе торгового объекта Игровой билет.

3. Проверить под скрейтч-слоем наличие текущего приза. В случае наличия под скрейтч-слоем наименования текущего приза получить приз в центрах выдачи призов.

4. В период с 9.00 15 сентября 2017 г. по 23.59 20 декабря 2017 г. зарегистрировать Игровой билет на сайте igra.korona.by, указав регистрационные данные. После успешной регистрации 15 (пятнадцати) Игровых билетов на сайте igra.korona.by, зарегистрировавшийся получал номер Участника в розыгрыше Главного приза.

По результатам проведения Рекламной игры 23 012 текущих призов нашли своих обладателей:
- ✓ 9680 пицц;
- ✓ 4769 кофе;
- ✓ 8281 подарочных сертификатов «Корона», номиналом 20,00 бел. руб.;
- ✓ 282 денежных призов на сумму 1000,00 бел. руб.

Победителем Главного приза – денежной суммы в размере 200 000,00 бел. руб. – стала жительница г. Молодечно РЫСИК МАРГАРИТА НИКОЛАЕВНА.

**Организатор Рекламной игры:** Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Квадрат», УНП 191682518.

**Юридический адрес Организатора**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, пом. 24.

**Наименование Рекламной игры**: «Корона СУПЕРПРИЗ».

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3063 от 04.08.2017 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Сроки проведения Рекламной игры:** 15 сентября 2017 г. – 28 февраля 2018 г.

Общее количество участников – 141538.

Призовой фонд Рекламной игры был разыгран не в полном объеме.

Полный список победителей размещен на сайте: **www.igra.korona.by**

